Унікальныя экспанаты — вернутыя ў Беларусь кнігі са знакамітага кніжнага збору Храптовічаў — упершыню прадставілі ў Музеі кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, піша БелТА. Каштоўныя выданні з бібліятэкі Храптовічаў былі вернуты ў Беларусь з Германіі ў 2023 годзе дзякуючы дзейнасці дыпламатычнай місіі па вяртанні гісторыка-культурных каштоўнасцей. Кніжная калекцыя ўжо ў XVIII стагоддзі лічылася адной з найбагацейшых ва Усходняй Еўропе: яна ўключала творы антычных аўтараў, французскую і італьянскую класічную літаратуру, працы па гісторыі розных краін, рукапісы. Два выданні канца XVIII — XIX стагоддзя на французскай мове, прысвечаныя падзеям, звязаным з такімі вядомымі гістарычнымі асобамі, як першы імператар Расійскай імперыі Пётр I і англійскі палкаводзец і палітычны дзеяч герцаг Мальбара Джон Чэрчыль, папоўняць калекцыю НББ. Пазнаёміцца з імі можна да 28 лютага.